# Назоўнікі 3-га скланення, іх канчаткі

**199.** Прачытайце назоўнікі. Да якога тыпу скланення яны адносяцца? Вызначце аснову ў кожным назоўніку. Назавіце апошні зычны асновы.

Любоў, радасць, мыш, глыб, маладосць, ноч, кроў, даль, печ, верф, соль, шыр.

**верф** — месца на беразе мора або ракі для пабудовы і рамонту суднаў

Запішыце назоўнікі ў тры слупкі па ўзоры.

| Узор: | аснова на цвёрды зычны | аснова на мяккі зычны | аснова на зацвярдзелы зычны |
|---|---|---|---|
| | *любоў* | *радасць* | *мыш* |
| | … | … | … |

**200.** Разгледзьце табліцу. Параўнайце канчаткі ў назоўніках 3-га скланення ў розных склонах.

| Склон | Ж. р., нулявы □ з асновай | | |
|---|---|---|---|
| | **на цвёрды зычны** | **на мяккі зычны** | **на зацвярдзелы зычны** |
| **Н.** | *любоў* □ | *радасць* □ | *мыш* □ |
| **Р.** | *любв*[*і*] | *радасц*[*і*] | *мыш*[*ы*] |
| **Д.** | *любв*[*і*] | *радасц*[*і*] | *мыш*[*ы*] |
| **В.** | *любоў* □ | *радасць* □ | *мыш* □ |
| **Т.** | *любоў*[*ю*] | *радасц*[*ю*] | *мышш*[*у*] |
| **М.** | *(у) любв*[*і*] | *(у) радасц*[*і*] | *(пры) мыш*[*ы*] |

У якіх склонах назоўнікі 3-га скланення маюць аднолькавыя канчаткі? У форме якога склону можа адбывацца падаўжэнне апошняга зычнага гука асновы?

Вусна праскланяйце назоўнікі *глыб, весялосць, печ.* Выкарыстайце ўзор скланення слоў, прапанаваны ў табліцы *(глыб → любоў, весялосць → радасць, печ → мыш).*

**201.** Прачытайце прыказку. Чаму так гаворыць?

Сады са**дз**і і **ў** маладос**ці**, і ў старас**ці**.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар і слоў. Запішыце прыказку па памяці. Падкрэсліце назоўнікі 3-га скланення. Вызначце іх склон, абазначце канчаткі.

**202.** Прачытайце тэкст. Чым знакаміты гарадскі пасёлак Любча?

### Любча́нскі замак

Багата ў Беларусі прывабных куточкаў. Сярод іх вылучаецца прыгажосцю мястэчка Любча.





Правообладатель Акадэмія адукацыі

На высокім беразе Нёмана месціцца тутэйшы замак. З высі адкрываецца дзівосны краявід. Праглядаецца рака. Яна нясе сваю магутную плынь да Балтыкі.

Замак будавалі ў выглядзе чатырохвугольніка. Вежы ўзіраліся ў даль байніцамі.

За свой доўгі век замак перажыў захопы і разрабленні. Аднак сумныя часы адыходзяць. Помнік на вачах адраджаецца з руін. *(Паводле Я. Малішэўскага.)*

**байні́ца** — шчыліна, невялікае акенца ў сцяне крэпасці

Выпішыце з тэксту сказы, у якіх ёсць назоўнікі 3-га скланення. Вызначце іх склон, абазначце канчаткі.

### Творчая хвілінка

Якія яшчэ замкі з'яўляюцца славутасцямі Беларусі? Раскажыце пра адзін з іх. Пры неабходнасці знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

**203.** Спішыце. Назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбную форму. Вызначце іх склон, абазначце канчаткі.

Гэтага дня Кастусь чакаў з асаблівай *(нецярплівасць)*. Ён неспакойна спіць у апошнюю *(ноч)* перад падарожжам. Хлопчык часта прачынаецца і глядзіць на гадзіннік. Да ад'езду можна яшчэ паляжаць у *(пасцель)*. Сэрца ж настойліва стукае: пара́! пара́! І Кастусь з *(радасць)* падымаецца.

❖ Знайдзіце ў тэксце сказ з аднароднымі членамі. Падкрэсліце ў гэтым сказе дзейнік і выказнік.

# Назоўны і вінавальны склоны

**204.** Прачытайце. Выпішыце тыя сказы, у якіх выдзеленыя назоўнікі з'яўляюцца дзейнікамі. Пазначце склон гэтых назоўнікаў. Абазначце ў іх канчаткі.

1. Азёрная **гладзь** блішчыць у промнях сонца. Лёгкі ветрык калыша азёрную **гладзь.** 2. На зямлю апусцілася марозная **ноч.** Брат і сястра доўга ўспаміналі навагоднюю **ноч.** 3. **Любоў** матулі абараняе дзяцей, падтрымлівае іх. Дзіця заўсёды адчувае бязмежную **любоў** матулі.

У якім склоне ўжыты выдзеленыя словы ў астатніх сказах?

**?!** Як можна адрозніць формы назоўнага і вінавальнага склонаў назоўнікаў 3-га скланення ў сказах?

У назоўным і вінавальным склонах назоўнікі 3-га скланення маюць **нулявы** канчатак.

**205.** Прачытайце спалучэнні слоў. Назавіце тыя з іх, якія напісаны па-беларуску. Чым адрозніваецца напісанне выдзеленых назоўнікаў у рускай і беларускай мовах?

| | |
|---|---|
| лясная **глуш** | лесная **глушь** |
| вялікая **печ** | большая **печь** |
| цёмная **ноч** | тёмная **ночь** |

Дапоўніце сказы беларускімі спалучэннямі слоў.

1. Зубры забраліся ў … … . 2. Пасярод вясковай хаты стаяла … … . 3. Лес ахýтала … … .

Запішыце сказы. Вызначце склон назоўнікаў 3-га скланення.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**206.** Сярод прапанаваных слоў знайдзіце сінонімы. Запішыце пары слоў.

Смеласць, сяброўства, адвага, прыязнасць.

**прыя́знасць** — сяброўскія і добразычлівыя адносіны

У парах слоў падкрэсліце назоўнікі 3-га скланення. Дапоўніце гэтымі назоўнікамі наступныя прыказкі.

1. ... гарады бярэ.
2. Праўдзівая ... ніколі не памрэ.

Назавіце сказ, які адпавядае схеме.




Запішыце сказ па памяці. Вызначце склон назоўніка 3-га скланення, абазначце канчатак.

**207.** Дапоўніце сказы словамі, якія падыходзяць па сэнсе.

1. ... выкарыстоўваецца для вырабу электрычных правадоў. Людзі даўно прымяняюць ... у электратэхніцы. 2. У ... людзі прымешваюць сокі розных траў. ... прызначаецца пры лячэнні хвароб, ран.

Словы для даведкі: *ма(з/с)ь, ме(дз/ц)ь.*

Запішыце сказы, раскрываючы дужкі. Падкрэсліце ў кожным сказе дзейнік і выказнік. Вызначце склон назоўнікаў 3-га скланення.

**208.** З асобных слоў складзіце сказы. Змяніце, калі неабходна, формы слоў.

1) Зімні, скончылася, ноч; 2) сонца, промні, пасерабрылі, гладзь, снежная; 3) пушыстая, шэрань, галінкі, пакрыла, дрэў; 4) лес, напоўнілі, і, загадкавасць, таямнічасць; 5) Каця, зачаравала, зімняга, лесу, прыгажосць; 6) радасць, дзяўчынка, адчула, і, задавальненне, сярод, дрэў, заснежаных.

Запішыце сказы. Знайдзіце ў іх назоўнікі 3-га скланення. Вызначце склон гэтых назоўнікаў, абазначце канчаткі.

## Родны, давальны і месны склоны

**209.** Прачытайце спалучэнні слоў.

падрыхтавалі (д л я к а г о?) для рысі
дапамаглі (к а м у?) рысі
сумавалі (п а к і м?) па рысі
дайшоў (д а ч а г о?) да печы
радаваўся (ч а м у?) печы
ляжаў (н а ч ы м?) на печы

Вызначце склон назоўнікаў 3-га скланення, назавіце іх канчаткі.

Якія канчаткі маюць назоўнікі 3-га скланення ў родным, давальным і месным склонах?

**210.** Прачытайце назоўнікі 3-га скланення. Вызначце ў іх аснову. Ахарактарызуйце апошні гук асновы.

Соль, кроў, рэч.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

Пастаўце назоўнікі ў форму роднага склону па ўзоры.

| | | |
|---|---|---|
| *соль — солі* | *кроў — крыві* | *рэч — рэчы* |
| сувязь — ... | любоў — ... | Нарач — ... |
| папараць — ... | верф — ... | ноч — ... |

Запішыце пары слоў. Выдзеліце канчаткі ў назоўніках роднага склону.

Назоўнікі 3-га скланення ў родным, давальным і месным склонах маюць аднолькавыя канчаткі ***-і, -ы***.

Назоўнікі з асновай на мяккі і цвёрды зычны маюць канчатак ***-і***, на зацвярдзелы зычны — ***-ы***.

**211.** Прачытайце тэкст. Дзе зімуе чубаты жаваранак?

## Чубаты жаваранак

Зіма ў самай моцы. Скрозь ляжаць глыбокія снягі. Дрэвы і кусты стаяць у бухматай шэрані.



На даху старой хаты сядзіць невялічкая шэрая птушка. Яна нягучна напявае. Колкі вецер з поўначы халодзіць птушцы кроў. Ён спрабуе спіхнуць малечу з даху. Аднак птушка не здаецца.

Гэта чубаты жаваранак. Ён застаецца ў нас зімаваць, не жадаючы развітвацца з роднымі мясцінамі. *(Паводле Р. Ігнаценкі.)*

**бухма́ты** — пушысты, пышны

Выпішыце з тэксту сказы, у якіх ёсць назоўнікі 3-га скланення. Вызначце іх склон, абазначце канчаткі.

❖ Чаму чубаты жаваранак быў птушкай 2017 года ў Беларусі? Знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

**212.** Падбярыце супрацьлеглыя па значэнні словы да прапанаваных. Запішыце антонімы парамі.

Дзень — …, гора — …, поўдзень — …, вясна — … .

Словы для даведкі: *радасць, поўнач, ноч, восень.*

Вызначце тып скланення назоўнікаў. Дапоўніце сказы назоўнікамі 3-га скланення.

1. Бабуля не спала да позняй … . 2. Унучка засмяялася ад … . 3. Гарадскі пасёлак Расоны знаходзіцца на … Беларусі. 4. Людзі радаваліся цёплай і сухой … .

Вызначце склон назоўнікаў 3-га скланення. Абазначце ў іх канчаткі.

**213.** Дапоўніце прыказкі патрэбнымі словамі. Чаму так гавораць?

1. Герой у ворага … не просіць. 2. Для … і кот вялікі звер. 3. На чужой старонцы і на … холадна. 4. І ў старой … агонь добра гарыць. 5. Хто з … працуе, той на старасці не шкадуе.

Словы для даведкі: *маладосць, літасць, печ, мыш.*

**лі́тасць** — велікадушныя адносіны; *рус.* поща́да

Запішыце прыказкі. Вызначце склон назоўнікаў 3-га скланення. Абазначце ў іх канчаткі.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

## Творны склон

**214.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце склон назоўнікаў. Назавіце іх канчаткі.

Свяціліся радасцю, любаваліся шыр'ю, гаварыла з любоўю.

Ганарыліся моладдзю, пасыпаў соллю, пакрыўся граззю.

Любаваліся Нара**чч**у, бегаў за мы**шш**у, называюць глу**шш**у.

Якія канчаткі маюць у творным склоне назоўнікі 3-га скланення?

?! Калі падаўжаецца апошні зычны гук асновы?

Назоўнікі 3-га скланення ў творным склоне маюць канчаткі ***-у, -ю***. Назоўнікі з асновай на зацвярдзелы зычны (акрамя ***р***) маюць канчатак ***-у***. Астатнія маюць канчатак ***-ю***.

Пры гэтым апошні зычны гук асновы падаўжаецца паміж галоснымі.

**215.** Пастаўце назоўнікі ў форму творнага склону па ўзоры.

*Радасць* — *радасцю*, маладосць — …, весялосць — …; *шыр* — *шыр'ю*, Сібір — …, Свір — …; *любоў* — *любоўю*, кроў —…; *медзь* — *меддзю*, мазь — …, Беларусь — …; *мыш* — *мышшу*, печ — …, ноч — … .

**Гаварыце правільна!**

Глыб'**ю**, верф'**ю**, шыр'**ю**, Сібір'**ю**, Свір'**ю**.

**216.** Прачытайце. Дапоўніце тэкст патрэбнымі словамі, прапанаванымі ў дужках.

У Белавежскую пушчу прыйшла (*вясна, восень, зіма*). Лес упрыгожыўся золатам і (*белізна, зелень, чырвань*). Лісце на дубах адлівае (*медзь, колеры вясёлкі*).

Сэрца напаўняецца захапленнем і (*радасць, жаль, нянавісць*), калі гуляеш па пушчы.

Запішыце тэкст. Знайдзіце ў сказах назоўнікі 3-га скланення. Вызначце іх склон, абазначце канчаткі.

**Гаварыце правільна!**

**Су́вязь, у су́вязі** са святочнымі падзеямі, задаволены тэлефоннай **су́вяззю.**

**217.** Да слоў з левага слупка падбярыце блізкія па значэнні словы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| блакіт | шыр |
| шырыня | рэч |
| прадмет | сінь |

Вызначце тып скланення назоўнікаў. Дапоўніце сказы назоўнікамі 3-га скланення.

1. Дзеці любаваліся … яснага неба. 2. Над … палёў лятаў белы бусел. 3. Дзядуля даражыў гэтай каштоўнай … .

Вызначце склон назоўнікаў 3-га скланення. Абазначце ў іх канчаткі.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**218.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы.

1) Сябры, пайшлі, з, радасць, каток, на; 2) бабуля, мазь, змазала, рука; 3) мама, на, глядзела, з, дачушка, любоў; 4) чайка, над, лётаюць, Нарач.

Вызначце склон назоўнікаў 3-га скланення, абазначце канчаткі.

**219.** Спішыце. Назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбную форму. Вызначце іх склон, абазначце канчаткі.

Пасля доўгай зімняй *(ноч)* наступіла марозная раніца. Неба залілося яркай *(чырвань)*. Лёгкі вецер дыхнуў марознай *(свежасць)*. Хлопчыкі змазалі лыжы *(мазь)* памчаліся па снежнай *(гладзь)*. Перад імі адкрылася снежная *(даль)* ва ўсёй *(прыгажосць)*.

Знайдзіце ў тэксце сказ з аднароднымі членамі. Правільна афарміце яго на пісьме.

## Скланенне назоўнікаў у множным ліку

**220.** Прачытайце назоўнікі. Вызначце іх тып скланення.

Каза, пятля, поле, алень, рэч, гусь, пчала, вішня, гай, вадзіцель, печ, рысь.

Утварыце і запішыце формы множнага ліку прапанаваных назоўнікаў. Выдзеліце ў іх канчаткі. На якія пытанні адказваюць запісаныя назоўнікі?

**?!** Якія канчаткі маюць назоўнікі множнага ліку ў назоўным склоне?